**Месцы правядзеньня акцыяў фэстываля:**
Тэатар "ДзеЯ" (вул. Лізы Чайкінай, 16)
Тэатар Юнага Гледача (вул. Энгельса, 26)
Тэатр Беларускай Эксперымэнтальнай Драматургіі "Вольная Сцэна" (вул. Крапоткіна, 44)
Нацыянальны Цэнтар Творчасьці Дзяцей і Моладзі (вул. Кірава, 14)
Клюб "Рэактар" (вул. Веры Харужай, 29)

**Арганізатары:**

STOWARZYSZENIE MŁODYCH TWÓRCÓW – „KU TEATROWI"

KULTURNY KANTAKT

У арганізацыі фэстываля бралі ўдзел:

GOETHE-INSTITUT MINSK
INSTYTUT POLSKI
БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА
«Дыярыюш»
asm asacyacyia sučasnaga mastactva

**Фэстываль адбыўся дзякуючы дапамозе:**

MINISTERSTWA KULTURY I DZIEDZICTWA NARODOWEGO RP
WIADZ MIASTA POZNANIA
APEX
Fundacji IDEE

FUNDACJA BATOREGO
PRO HELVETIA Arts Council of Switzerland Cultural Exchange East-West
ВОЛЬНАЯ СЦЭНА
Клуб Сяброў

**Асаблівая падзяка арганізатараў для:**
Цэнтра "Супольнасьць" (logo)
Грамадзкага Руху БНФ "Адраджэньне"
Згуртаваньня Беларускай Шляхты
Для ўсіх сяброў, калегаў і добразычліўцаў

МЕДИСОНТ

Specyalne podzękowania dla przyjaciół którzy inspirowali: Pawła Kazaneckiego, Teatru Ósmego Dnia, teatru Cogitatur, The Living Theatre, Macieja Klimczaka, Pidżamy Porno, Kasi Kamockaj, Michała Aniempadystava, Królestwa Białoruś, Księcia Kropotkina.

*Jola K.*

**Інфармацыйная падтрымка:**

кур'ер
БЕЛОРУССКАЯ ДЕЛОВАЯ ГАЗЕТА
RADIO FREE EUROPE RADIO LIBERTY
РАДЫЁ РАЦЫЯ
Беларуская маладзёжная

© Графічны дызайн: М.Анемпадыстаў, Л.Раманчык, 2000

# Менская
Артыстычны Фэстываль
# Вясна



*Менская Вясна*

*Mińska Wiosna*

*Der Minskfrühling*

*The Minsk Spring*

*18-19-20 траўня 2000*

vytoki.net

*"Калі б, як настойвалі некаторыя вар'яты, мы супрацьстаялі толькі маўчаньнем і не рабілі фільмаў, спэктакляў, не пісалі кніг і музыкі, Польшча была б сёньня… Беларусьсю".*

*Анджэй Вайда*

**Міжнародны фэстываль**
**"МЕНСКАЯ ВЯСНА"**
**Менск**
**18-19-20 траўня 2000**

Міжнародны фэстываль „Менская Вясна" – гэта творчыя сустрэчы тэатральных і музычных груп, мастакоў і пэрформэраў, тэатразнаўцаў з розных гарадоў і краінаў. Усе ўдзельнікі фэстывалю вельмі розныя, але яднае іх імкненьне да творчага пошуку, экспэрымэнтальны падыход да мастацтва, неабыякавасьць да сацыяльных праблемаў. Але галоўнае для іх, напэўна, – гэта любоў да свабоды. Да свабоды як у творчасьці, гэтак і ў жыцьці. Артыст, творца патрабуе свабоды для сябе, для сваіх калегаў, для сваёй публікі – бяз гэтага мастацтва гіне альбо ператвараецца ў пачварнасьць. Адчуўшы сябе вольным сапраўдны, творца заўсёды гатовы працягнуць руку падтрымкі й дапамогі тым, каму зараз цяжка. Таму "Менская Вясна" – гэта ня толькі сьвята мастацкага авангарду, гэта – вялікая акцыя салідарнасьці творцаў эўрапейскай культуры зь беларускімі сябрамі і калегамі, зь беларускім народам.

Ідэя такой сустрэчы нарадзілася падчас творчага супрацоўніцтва артыстаў і грамадзкіх арганізацый з Познані й Менску. За апошні час менскія гледачы змаглі пазнаёміцца з творчасьцю познаньскага „Тэатру Восьмага Дня", а публіка Познані, Варшавы, Кракава, Беластоку сустрэлася з „Народным Альбомам", зь лепшымі беларускімі рок-гуртамі.

Цяпер у беларускай сталіцы чакаюцца госьці з Польшчы й Нямеччыны. Бяруць удзел у фэстывалі беларускія артысты зь Менску й Горадні.

Фэстываль арганізаваны Таварыствам „Ku Teatrowi" (Познань), грамадзкай ініцыятывай "Культурны Кантакт". У арганізацыі брали ўдзел Беларуская Музычная Альтэрнатыва, "Дыярыюш", Асацыяцыя "Сучаснае Мастацтва"ды іншыя грамадзкія арганізацыі зь Беларусі, а таксама Інстытут Гётэ ў Менску, Польскі Інстытут у Менску.



**ПРАГРАМА ФЭСТЫВАЛЯ**
**"МЕНСКАЯ ВЯСНА"**

**18 ТРАЎНЯ (ЧАЦЬВЕР)**

**11.30 – "Амэрыканскі экспэрымэнтальны тэатар"** – відэафільмы: "Bread and Puppet" "The Wooster Group" Камэнтары Магда Грудзіньска, Ёана Астроўска (Польшча) *Тэатар "Вольная Сцэна"*

**16.00 – прэс-канфэрэнцыя** *Тэатар "Вольная Сцэна"*

**17.00 – "Акцыя-Вуліца-Свабода"**– відэафільмы: "84 дні хаджэньня", "Студзеньская рака" і "Гукі Сэрбіі" (Бэлград 1996–97) "Рэвалюцыя гномаў" ("Апэльсынавая Альтэрнатыва", Польшча 1988–89) Сустрэча з Вальдэмарам Фыдрыхам "Маёрам", ініцыятарам "Альтэрнатывы" *Тэатар "Вольная Сцэна"*

**19.00 – Канцэрт:** "Новае Неба" (Беларусь), "Крыві" (Беларусь), Яцэк Клейф і "Orkiestra Na Zdrowie" (Польшча) Клюб "Рэактар"

**19 ТРАЎНЯ (ПЯТНІЦА)**

**14.00 – Пэрформанс:** Мечыслаў Скалімоўскі, Лукаш Главацкі, Ягна Цюхта (Польшча), Віктар Пятроў, Дзяніс Раманоўскі (Беларусь). Акцыя тэатра "Акадэмія Руху" (Польшча) *Тэатар "ДзеЯ"*

**17.00 – "Тутэйшыя"** – Гарадзенскі Тэатар Лялек *Тэатар "ДзеЯ"*

**18.30 – Канцэрт:** "Gelee Royale" (Нямеччына) *Тэатар "Вольная сцэна"*

**21.00 – "Ёлка У"** – Тэатр "Жэст" (Менск) *Тэатар Юнага Гледача*

**20 ТРАЎНЯ (СУБОТА)**

**14.00 – "Lekcja angielskiego"** – Тэатар "Акадэмія Руху" (Польшча), сустрэча зь лідэрам тэатру Войцэхам Крукоўскім *Тэатар Юнага Гледача*

**15.30 – Пэрформанс:** Віктар Пятроў, Аляксей Іваноў, Аляксандар Родзін, Лявон Вольскі (Беларусь) *Тэатар Юнага Гледача*

**17.00 – "Cabaret Neopathetique"** – Тэатар "Cogitatur" (Польшча) *Тэатар "ДзеЯ"*

**18.00 – Прэс-канфэрэнцыя** *Тэатар "ДзеЯ"*

**18.00 – Канцэрт:** Група "Diffusion Ensemble" (Польшча, Нямеччына), Клаус дэр Гайгэр (Нямеччына), група "Плато" (Беларусь) *Цэнтар Творчасьці Дзяцей і Моладзі*

**19.00 – Канцэрт:** "Уліс" (Беларусь), "N.R.M." (Беларусь), "Pidżama Porno" (Польшча) *Клюб "Рэактар"*

vyteki.net

М У З Ы К А

## УДЗЕЛЬНІКІ ФЭСТЫВАЛЮ: МУЗЫКА

**"Pidżama Porno" / "Піжама Порна"**
**Познань, Польшча**

"Pidżama Porno" / "Піжама Порна" паўстала ў сьнежні 1987 зь ініцыятывы Кшыштафа Грабоўскага / Krzystof Grabowski й Анджэя Казакевіча / Andrzej Kozakiewicz, тады студэнтаў Познаньскага Унівэрсытэту.

У 1989 гурт запісаў свой першы матэрыял пад назваю "Ulice jak Stygmaty" / "Вуліцы як Стыгматы". Адначасова музыкі дэбютавалі на фэстывалі ў Яроцыне, у Сопаце ды выступілі ў Празе як першая група польскага андэрграўнда.

У 1990 "Піжама Порна" запісала ў Шчэціне другі дыск "Futurista" / "Футурыст". З гуртом выступала тады яшчэ нікому невядомая Кася Насоўска / Kasia Nosowska. У 1990 "Піжама" зноў выступіла на Яроцінскім фэстывалі, адыграла 15 канцэртаў у Чэхаславакіі, пасьля чаго распалася.

У студзені 1995 група адрадзілася. Тады ж зьявіўся максысынгал «Zamiast burzy» / "Замест буры", які прынёс "Піжаме" вялікую папулярнасьць і новае пакаленьне фанаў.

У 1995–96 гурт быў канцэртным "цьвіком" многіх незалежных фэстываляў па ўсёй Польшчы, дзе выступаў разам з такімі заходнімі "монстрамі", як "Chumbawamba" і "Youth Brigade".

Песьні з дыску "Ziodzieje Zapalniczek" / "Злодзеі запальнічак" (1997) – "Эзатэрычная Познань" і "Баль у Сэнатара'93" – доўга не сыходзілі са сьпісаў хітоў на польскіх радыёхвалях, а відэакліп "Баль у Сэнатара'93" трапіў у сьпіс трох лепшых польскіх тэледыскаў 1997.

У 1999 вышлі новыя дыскі групы – "Styropian" (пенапласт) і "Ulice jak stygmaty – absolutne rarytasy" / "Вуліцы як стыгматы – абсалютныя рарытэты". На восень 2000 гурт абяцае наступны дыск з цалкам новым матэрыялам.

Лідэра "Піжамы Порна" Кшыштафа "Грабаж" Грабоўскага / Krzysztof «Grabaż» Grabowski, разам з Мацеям Маленчуком, Казікам Сташэўскім і Зьбігневам Сташчыкам, уважаюць за аднаго з найлепшых польскіх рок-паэтаў. Тэксты Грабажа функцыянуюць таксама й бяз музыкі – аўтар ёсьць зоркаю многіх літаратурных мітынгаў. Ягоныя вершы былі выдадзеныя ў паэтычным томіку «Welwetowe swetry» / "Вэльвэтавыя швэдры" і друкаваліся ў розных літаратурных пэрыёдыках. Кшыштаф Грабоўскі таксама адзін з найпапулярнейшых познанскіх радыё-мадэратараў.

Сталыя ўдзельнікі гурта:

Kozak – гітара, вакал
Dziadek – гітара, вакал
Kuzyn – пэркусія
Julo – бас-гітара

**„Orkiestra Na Zdrowie" / „Аркэстар На Здароўе"**
**Варшава, Польшча**

Існуе ўжо 11 гадоў. Раней частка музыкаў грала ў аркэстры "Разам". Зьмянілі назоў, пераехалі з-пад Люблiна ў Варшаву, дзе іх прыняў Дом Культуры на Ахоце. Там музыкі працуюць і зараз.

Адпачатку існаваньня праз аркэстар прайшло шмат вядомых пазьней музыкаў, між якімі – Куба Сянкевіч і Антаніна Кшыштань.

Як гавораць самі ўдзельнікі аркэстру, іхная музыка – гэта *"натуральная музыка для руху і для слыху, моцна падтрыманая рытмам."*

"На здароўе" не палюе за ўзнагародамі, але заўсёды ахвотна іх прымае. У 1995 атрымаў узнагароду перадачы "Кгксі sik" /"Круціцца".

Запісалі касэту "Ёсьць лёс" / "Jest los".

Склад гурта:

Jacek Kleyff / Яцэк Клейф – гітара, сьпевы, бубны
Dariusz «Nakon» Nakonieczny / Дарыюш "Након" Наканечны – бас, сьпевы
Anna Patynek / Ганна Патынэк – сьпеў, бубны
Jacek «Jawa» Warszawa / Яцэк "Ява" Варшава – пэркусія, бубны, гармонік
Jacek «Jонь» Osior / Яцэк "Лось" Асёр – электрычная гітара, сьпеў

**Гурт "Gelee Royale"**
**Бэрлін, Нямеччына.**

Гурт "Gelee Royale" (пчалінае малачко) заснаваны ў 1997. Самі ўдзельнікі вызначаюць свой стыль як мульцімэдыяльны праект, на стыку музыкі, пэрформансу й сьветлавога дызайну. Гурт выступаў на розных сцэнах Нямеччыны, удзельнічаў у міжнародных фэстывалях сучаснай музыкі, узнагароджаны прэміяй Свабоднага Унівэрсытэту Хэрысаў (Швайцарыя), запісаў 2 CD.

Склад гурта:

Guy Bettini / Гі Бэцьціні – Труба
скончыў Акадэмію мастацтваў Міляну, стажываўся ў Лючыяна Фабро.

Davide deBernardi / Давід дэБэрнардзі – Кантрабас

Mirko Gargioni / Мірка Гаргіоні – пэркусія

mrtz (Морыц Вэрмельскірх) – сьветлавы дызайн
С 1990 г. займаецца праекцыямі, распрацоўвае й будуе абсталяваньне для рухомых выяваў

Jörg Maria Zeger /Ёрг Марыя Цэгер – Электрагітара

Dietrich Pank / Дзітрых Панк – Тэхнік па гуку

Сэбасьцьян Хількэн /Sebastian Hilken – Імправізацыя

*Канцэрт 19 мая, 18.30*
*Тэатар Сучаснай Беларускай Драматургіі "Вольная сцена", вул. Крапоткіна, 44*

"Diffusion Ensemble" / "Ансамбль Дыфузыі"
Jerzy Mazzol / Ежы Мацоль і Robert Knuth / Робэрт Кнут
Гданьск, Польшча
Дзюсэльдорф, Нямеччына

Робэрт Кнут і Мацоль складаюць "Ансамбль Дыфузыі". Яны прадстаўляюць дыфузыю "ARENA VERONA" / "Арэна Вэрона" – жывую музыку й дыфузыю навакольных вобразаў, дзе Мацоль – клярнэт, Робэрт Кнут – голас і іншыя гукі, з удзелам Фэлікса Дроэза / Felix Droese – аб'ект-інсталяцыя.

vytoki.net

"Diffusion Ensemble" – інтэрдысцыплінарная група, якая была створаная для патрэбаў так званай "дыфузы", гэта значыць сымультанічных імправізацыяў артыстаў розных накірункаў мастацтва на сцэне. У выніку гэтых экспэрымэнтаў музыка групы дасягае да невядомых і не дасьледваных яшчэ абшараў гуку і яго энэргетычных эманацый. Тое, чым ансамбль займаецца, гэта творчыя працэсы пранікненьня і абмену, партытуры бязь межаў – тут і зараз. Гэта, па словах Робэрта Кнута, – *"праекцыя арытмічных знакаў, ідэяграмаў, гукаў, вобразаў, псыхічных станаў..."*. "Diffusion Ensemble" выступаў у розных канцэртных залях, галерэях і тэатрах Эўропы, сустракаючы паўсюль цёплы прыём публікі і крытыкаў.

Група выконвае кампазыцыі Мацоля адпаведна ідэі Arythmik Perfection, карыстаючыся новай сістэмай запісу, дзе музыкі ёсьць ня толькі выканаўцамі партытуры, але бяруць чынны ўдзел у стварэньні музычнай містэрыі. Яны трактуюць імправізацыю як сродак сьвядомага кіраваньня выпадкам, а адхіленьні ці памылкі — як інтэгральнаую частку кампазыцыі. Суб'ектыўная практыка "спатканьня ў дарозе" дазваляе выканаўцам адкрыць тую не прызнаную частку музыкі, якая знаходзіцца як бы па іншым баку Чорнай Дзюркі. Арытмія – гэта ня толькі поліrытмія, ці безрытмія, гэта таксама рытм і штосьці большае, штосьці такое, што мы ледзьве адчуваем і дакуль ня можам дацягнуцца зусім... Гэты Шлях й ёсьць існасьцю. Свабода, гэтак жа, як і няволя, ёсьць яго інтэгральнымі элемэнтамі. Дастаткова нам толькі заўважыць, што тая вэрсыя рэчаіснасьці, якую маем, ёсьць найлепшаю вэрсыяй, як ўжо пачуем нечаканыя, арытмічныя гукі "Diffusion Ensemble".

Ежы Мацоль – музыкант, кампазітар, клярнэтыст-віртуоз, які жыве ў Гданьску.

Мацоль – адна з прыкметных фігураў маладога авангарду, творца ідэі *Arythmik Perfection*. Аўтар музыкі для фільмаў, тэатральных спэктакляў, тэлевізыйных праграм, удзельнік мноства фэстываляў. З 1994 разам з Робэртам Кнутам супрацоўнічае як творца музычных пэрформансаў – мульцімэдыяльных спэктакляў, якія яны называюць *"дыфузыямі"*.

Робэрт Кнут – вучыўся ў Гданьску, у 1978–80 быў стыпэндыятам Фонду Касьцюшкі ў ЗША. Браў удзел у шматлікіх выставах у Польшчы, ЗША, Францыі, Японіі, Італіі й Нямеччыне.

Заснавальнік мастацкай групы "Paul Pozozza Muzeum" у Дзюсэльдорфе. Кульмінацыяй ідэі і дзейнасьці гэтай групы сталі праект галерэі "Delikatesy Avantgarde", заснаванай у 1994 у Гданьску, і праект "Cross Culture", які дзейнічаў на збліжэньне артыстаў з розных краёў, розных поглядаў, розных галінаў мастацтва.

**Гурт "Уліс" / Ulis**
**Менск, Беларусь**

Каманда існуе ад канца 80-х гадоў. Ад таго часу "Уліс" стаўся для моладзі сымболем рамантычнага пэрыяду беларускага Адраджэньня ў сучаснай музыцы. Першы прафэсыйны беларускі альбом, выдадзены на кружэлцы ў Польшчы, належаў менавіта "Улісу"; некалькі песень, якія сталі гімнам свабоды ("Танцы на даху", "Радыё Свабода") і пачатак "новай хвалі" ў айчыннай рок-музыцы – да палітычнай рэакцыі 1994 – зрабілі каманду супэрпапулярнай.

Розныя прычыны вымусілі "Уліс" спыніць сваё існаваньне ў 1994. Але ўжо з 1995 "Уліс" распачынае новы пэрыяд творчасьці: вакалістам робіцца музычны крэатар каманды Слава Корань, які вырашае спыніцца на радыкальным *indie*, – "Уліс" перажывае пэрыяд уласнага адраджэньня. Музыка каманды зрабілася вельмі цяжкай, але прыкметна ўзрос прафэсыяналізм выканаўцаў. Лепшы гітарыст Беларусі Слава Корань піша ня толькі музыку, але й тэксты, якія выконвае гурт.

Новы рэліз гурта "Падарожжа" выходзіць летам 2000.

Склад:
Слава Корань – вакал, гітара,
Віктар Самарукаў – бас-гітара,
Аляксандар Быкаў – бубны.

**N.R.M.**
**Менск, Беларусь**

Гурт N.R.M. паўстаў у 1994 годзе, пераняўшы спадчыну культавай беларускай каманды "Мроя".

Першы альбом гурта "Лалалала" (1995) быў запісаны ў рамках традыцыйнага хард-року з элемэнтамі панку, але ў ім праглядаліся рысы таго, што ўжо ў 1996 вылілася ў канцэптуальны альбом "Одзірыдзідзіна" – прыхаваная сацыяльна-палітычная лірыка ў блізкай для моладзі гіранічнай інтэрпрэтацыі спалучалася з моднай гранджавай мэлёдыкай. Песьня "Партызанская" з гэтага альбому – гімн беларусаў "новай фармацыі", дзе ўпершыню сфармуляваны прынцыпы жыцьця і змаганьня *за сваё*. "Партызанская" стала візытоўкай гурта і зрабіла яго, без перабольшваньня, самым папулярным у Беларусі.

Канцэптуальны рэліз "Пашпарт грамадзяніна N.R.M." (1998) упершыню быў прызнаны крытыкамі самым пасьпяховым у творчым і камэрцыйным пляне беларускім альбомам году.

Многія тэксты гурта створаны ягоным лідэрам Лявонам Вольскім, які нярэдка выступае ня толькі як паэт ці музыкант, але й як мастак.

У 1997 Кабінет міністраў ваенізаванай Niezalieïnaj Respubliki Mroja атрымаў пасаду "Рок-каралёў' 97".

Зараз гурт схіляецца да модных фанку, хард-кору і рэп-кору з элемэнтамі беларускай музычнай рэчаіснасьці.

Увесну 2000 выйшаў першы беларускі "Самотнік" (*single*) з мультымэдыйнымі трэкамі.

Склад:
Лявон Вольскі — гітара, вакал.
Алег Дземідовіч — бубны, бэк-вакал,
Юрась Ляўкоў — бас-гітара, бэк-вакал,
Піт Паўлаў — гітара, бэк-вакал,

**Гурт "Крыві" / Kryvi**
**Менск, Беларусь**

Гурт заснаваны ў 1996 годзе на базе фольк-мадэрн студыі "Палац".

Адпачатку сваю стылістыку акрэсьліў як арт-мадэрн-фольк, спалучэньне старажытных традыцыяў гарлавых сьпеваў, старажытных беларускіх інструмэнтаў і кампутарных музычных тэхналёгіяў.

У першых альбомах "Крыві" "Hei-loli", у радыё-міксе "Kriwi"

vytoki.net

(1997) аўтэнтычны фальклёр удала спалучаўся то з танцавальнымі, то з мэдытатыўнымі кампутарнымі апрацоўкамі і надзвычай прыцягальнымі вакаламі Веранікі Кругловай ды Зьміцера Вайцюшкевіча.

Але альбом "За туманам..." (1998) засьведчыў пераход "Крыві" да "жывога" выкананьня кампазыцыяў: роля кампутараў мінімалізавалася, былі ўведзеныя бубны, акустычная і электрычная гітары. Гэты рэліз зрабіў гурт, у якім паважнае месца заняў гітарыст Піт Паўлаў, адным з самых папулярных у Беларусі.

Пасьля выхаду Live-альбому "Людзям" (1999) гледачы й крытыкі бачылі "Крыві" адзінымі намінантамі на званьне "Рок-каралёў", што і пацьвердзілася на штогадовым фэсьце "Рок-каранацыя' 99".

"Крыві" пастаянна выступаюць з канцэртамі ў Польшчы, Нямеччыне, Францыі. Гурт браў удзел у праектах "Народны альбом" і "Сьвяты Вечар'2000".

Склад:
Вераніка Круглова — вакал,
Зьміцер Вайцюшкевіч — мульці-інструмэнталіст, вакал,
Піт Паўлаў — гітара, бэк-вакал,
Махмуд — мульці-інструмэнталіст, бэк-вакал.

**Гурт "Новае Неба"/ Novaje Nieba**
**Менск, Беларусь**

Гурт "Новае Неба" зьявіўся ў 1991. Ля вытокаў "НН" стаялі бард-сьпявачка Кася Камоцкая і гітарыст Лявон Шырын. У 1991 "НН" пачынае граць электрычны рок – у запісе першага альбому "Дзеці чорнага гораду" актыўны ўдзел бралі музыкі гурта "Мроя", якія фармавалі пазьней стылістыку "НН".

Як адзначае салістка гурта Кася Камоцкая, для яе пры стварэньні песень першачарговае значэньне мае тэкст. НН агучвае тэксты прадстаўнікоў "новай беларускай літаратурнай фармацыі": Міхала Анемпадыстава, Адама Глёбуса, Анатоля Сыса, Тацяны Сапач, Лявона Вольскага.

У інтэрвію 1997-98 Кася адзначала, што беларуская паэзія перажывае ня самыя лепшыя часы, гэтым тлумачыцца доўгае маўчаньне "НН". Адсутнасьць альбомаў (апошні арыгінальны "Мая краіна" выйшаў у 1996) ускосна тлумачыцца разрывам адносінаў з гуртом "Мроя" (з 1995 — NRM).

Нягледзячы на чуткі пра сьмерць "НН", у 1997 Кася Камоцкая пачынае супрацоўнічаць з музыкамі гурта "Уліс". Напачатку "НН" успрымалі як элітарны, разьлічаны на інтэлектуальную публіку праект. Выданы ў 1995 рэліз "Go home" з тытульнай песьняй "Прэзыдэнт, ідзі дамоў!" дазволіў казаць пра ўзрастаючую папулярнасьць гурта перш за ўсё сярод моладзі.

На працягу трох гадоў ішоў пошук новага гучаньня гурта, а ў кастрычніку 1999 выйшаў новы CD "НН" "Cepieliny" — самы "цяжкі" рэліз у беларускай альтэрнатыўнай музыцы за апошнія гады. Магчыма, праз пэўны час "НН" вернецца да больш папулярнай рок-музыкі – прагназуе сама Кася Камоцкая.

Склад:
Кася Камоцкая — вакал,
Аляксандар Быкаў — бубны,
Аляксей Паўловіч — бас-гітара.

**Klaus der Geiger / Клаус дэр Гайгэр (Клаус Скрыпач)**
**Кёльн, Нямеччына**

Клаус фон Врохэм, які цяпер называе сябе "der Geiger" – "Скрыпач", нарадзіўся ў 1940. Вучыўся музыцы ў Кёльне, працаваў у сымфанічных аркэстрах Нямеччыны й ЗША, кампанаваў і інтэрпрэтаваў сучасную музыку ва ўнівэрсытэтах Буфала і Сан-Дыега. Пад уплывам хіпі й антываеннага руху ён стаў вулічным музыкаю.

*"Выступы Клаўса падобныя да прыроднай зьявы – гэта цудоўна, гэта трэба перажыць! Ягоны стыль немагчыма апісаць: гэта ня блюз, хаця штосьці ад блюзу прысутнічае, гэта ня рок і ня фольк. Ясна адно – гэта захоплівае й трымае ад пачатку й да канца..."* – пісалі пра канцэрты Клаўса крытыкі.

Сёньня Клаўс Скрыпач неаддзельны ад кёльнскіх вуліцаў. Песьні, што ён выконвае (свае й іншых, часта малавядомых аўтараў), ясныя й простыя, яны апавядаюць пра чалавечыя пачуцьці, беды й страх. Клаўс належыць да тых нямногіх творцаў, якія адышлі ад жыцьця "ў клясычнай музыцы", але не далучыліся да руху рок-пратэсту альбо да шоў-бізнэсу.

У апошнія гады Клаўс Скрыпач выступаў у Босьніі, Марока, Японіі, ЗША.

**Гурт "Плато"/ Plato**
**Менск, Беларусь**

Гурт існуе з канца 1994. Крэда групы – акустычная музыка, заснаваная на этнічных музычных традыцыях народаў сьвету (acoustic world music). Асабліва цікавыя для "Плато" кельцкі фальклор і музычныя традыцыі Ўсходу, але кампазыцыі групы ня ёсьць сучаснымі перапрацоўкамі народных мэлёдый, а захоўваюць толькі стыль і дух тых часоў. Для "Плато" характэрна выкарыстаньне арыгінальных музычных инструмэнтаў розных народаў сьвету.

Склад:
Андрэй Румянцаў – тэксты, музыка, ліра, флейты, фартэпіана, гітара, акардэон, вакал
Матвей Сабураў – тэксты, музыка, гітара, вакал.
Анастасія Сабурава – тэксты, вакал.
Сяргей Старыковіч – кантрабас, акустычная бас-гітара
Алена Ціхмановіч – віялянчэль
Вольга Кувшынчыкава – скрыпка
Васіль Мелех – пэркусія
Вячаслаў Трусевіч – бонгі, барабан, дарбука
Сяргей Хлыстун – гукарэжысёр
Дзяніс Сікорскі – дырэктар.

vyteki.net

ТЭАТРЫ, АКЦЫІ

**Teatr Akademia Ruchu / Тэатар "Акадэмія Руху" / Варшава, Польша**

Тэатар Akademia Ruchu паўстаў у студэнцкім асяродзьдзі Варшавы ў 1973. Сёньня – гэта вядомая група, якая прадстаўляла польскі тэатар у Эўропе і Амэрыцы, дзе, беручы ўдзел у важнейшых фэстывалях і ладзячы ўласныя турнэ, адначасова праводзіла тэатральныя ўоркшопы. Заснавальнікам групы й яе мастацкім кіраўніком застаецца Wojciech Krukowski / Войцэх Крукоўскі, цяпер дырэктар Цэнтра Культуры ў Замку Ўяздоўскім.

Akademia Ruchu вядомая перадусім як тэатар руху й візуальнай нарацыі; сёньня гэта – інтэрдысцыплінарная творчая група, якая працуе на памежжы тэатру і пластычнай акцыі. Асноўнае, што вызначае працу Akademii, – гэта рух, прастора і грамадзкі сэнс.

Адзін з важных накірункаў сёньняшняй актыўнасьці групы – адукацыйная праца.

Спэктакль „Lekcja angielskiego" / "Лекцыя ангельскай"

Склад тэатру:
Janusz Baidyga / Януш Балдыга
Wojciech Krukowski / Войцех Крукоўскі
Jolanta Krukowska / Ёлянта Крукоўска
Ryszard Kawalec / Рышард Кавалец
Zbigniew Olkiewicz / Збігнеў Алькевіч
Jan PieniNеїek / Ян Пенёнжэк
Krzysztof Їwirblis / Кшыштаф Жвірбліс

**Teatr "Cogitatur" / Театр "Кагітатур"
Катавіцэ, Польшча**

Тэатар "Cogitatur" шмат гадоў творча працуе ў Катавіцэ як незалежная, тэатральная група, якая сама фінансуе свае пачынаньні. Стварылі яе людзі, якія злучаныя зь літаратурна-выдавецкім асяродзьдзем і яднаюць вакол свайго тэатру паэтаў і літаратараў. Прадстаўленьні "Cogitatura" – гэта заўсёды тэатар добрай літаратуры і філязофіі, ёсьць у іх брэхтаўская дыстанцыя, абсурд і гратэск, адным словам, вытанчаная й выдатная забава. Публіка тэатру – гэта перш за ўсё моладзь, для якой ладзяцца тэатральныя заняткі, але таксама й "людзі з фабрык". "Cogitatur" грае свае спэктаклі ў залі на адным з катавіцкіх "цёмных падворкаў", над рэстарацыяй і кавярняй, якіх ёсьць гаспадаром і ўласьнікам. У ягонай сядзібе выступаюць таксама іншыя тэатры. Дзейнасьць яго творыць інтэлектуальнае й артыстычнае асяродзьдзе Катавіцэ, а праз штогадовы Міжнародны Фэстываль Тэатраў "A Part" (у бок), які арганізуе Cogitatur, ён істотна ўплывае на тэатральнае жыцьцё Польшчы.

Спэктакль "Cabaret Neopathetique"

Сцэнары й рэжысура: Witold Izdebski /Вітальд Іздэбскі
Акторы: Katarzyna Mrozinska-Izdebska / Катажына Мрозіньска-Іздэбска
Marcin Herich / Марцін Гэрых
Marek Radwan / Марэк Радван
Музыка: Leszek Kwasniewicz / Лешак Квасьневіч

Спэктакль гэты зьявіўся пад выразным уплывам Фрыдрыха Ніцшэ, які прысьніўся аднойчы адразу ўсім акторам. На золку яны зразумелі, што самае важнае – гэта сьвятасьць чалавецкасьці. І калі запеў певень, усе як адзін напісалі на дзьвярох сваіх спальняў: "Але як жыць? Як жыць?" Тады Заратустра, сходзячы з гор, схапіўся за галаву ды запісаў у сваім нататніку: "Аб чым гаворка? Аб чым?" І так паўстаў сцэнары (Witold Izdebski), у самай сярэдзіне дня, калі хмары закрылі неба, а дождж крапіў глебу, на якой выраслі невялікія спачатку абсурды. Гэта было фантастычнае лібрэта, якое засмуціла аднаго кампазытара (Leszek Kwasniewicz) так, што ён напісаў музыку, якая нічога не азначала, смутная, як рыпеньне нябесных сфэраў, калі іх мацней падштурхнуць. Надышла тады, зь непагадзі й фантасмагорыі, Хвістка Шаранта Дол / Chistka Sharanta Doll (Katarzyna Mrozinska-Izdebska); узяла ў свае рукі дзьмухаўцы і расцярушыла іх на дарозе, па якой крочылі Геронім Пляга / Hieronim Plaga (Marek Radwan) і Сэргіюш Порк / Sergiusz Pork (Marcin Herich). Пакуль яны схіляліся над раздьмутымі па дарозе надзеямі экзыстэнцыяльнай філязофіі, пераехаў іх самаход (машина часу). "Хіба гэта не поўнае вар'яцтва", – піша Дастаеўскі ў "Ідыёце". І хіба не. Хто ведае…

Спэктакль быў паказаны ў многіх местах Польшчы, на фэстывалях у Катавіцэ, у Шчэціне, у Быдгошчы й Саноку. У 1994 тэатр атрымаў за Cabaret Neopathetique "Залатую Маску" – узнагароду польскіх тэатральных рэцэнзэнтаў.

**Гарадзенскі абласны Тэатар Лялек / Puppet-Theatre of Horadnia Province
Горадня, Беларусь.
Галоўны рэжысёр – Аляксандар Ігнаценка**

Гарадзенскі Тэатар Лялек быў створаны ў 1980 і разьмяшчаецца ў гістарычным будынку тэатра, які належаў Антонію Тызэнгаўзу і быў збудаваны ў XVIII ст. За гэты час тэатар паказаў больш за пяцьдзесят спэктакляў на беларускай, польскай і расейскай мовах. Большасьць – гэта пастаноўкі для дзяцей, пераважна казкі, але тэатар працуе й для дарослага гледача, аб чым сьведчаць пастаноўкі Мальера, Мрожака, Мэтэрлінка, Эйроля, Галубка. "Тутэйшыя" – лялечнае ўвасабленьне знакамітай пьесы клясыка беларускай літаратуры Янкі Купалы – лепшая з апошніх работ тэатра.

Тэатр шмат ездзіць па Беларусі, пабываў і ў Польшчы, Францыі, Нямеччыне.

На фэстывалі тэатар прадстаўляе спэктакль "Тутэйшыя" паводле Янкі Купалы.

Рэжысёр – Мікалай Андрэеў
Мастак – Ларыса Герлаван
Музыка – Сяргей Бельцюкоў

Ролі выконваюць:
Юры Мянько
Віктар Шалкевіч
Аляксандар Ігнаценка
Тамара Лабар

vytoki.net

Тэатар плястычнага гратэску "Жэст" / Zhest
Менск, Беларусь.
Кіраўнік – Вячаслаў Іназемцаў

Тэатр "Жэст" быў заснаваны ў 1980. За дваццаць год былі падрыхтаваныя каля 20 спэктакляў, кожны зь якіх быў як бы новай лекцыяй у спасьціжэньні мастацтва плястычнага тэатру – ад клясычнай пантамімы ў першых спэктаклях да буфанады й кляўнады; потым былі пошукі сынтэзу заходніх і ўсходніх традыцыяў, хэпэнінг. Сёньняшнія экспэрымэнты тэатра зьвязаныя з авангарднай японскай тэхнікай танца бута – пазнаёміцца зь імі можна ў спэктаклі "Ёлка У".

Свае творчыя прынцыпы тэатар "Жэст" фармулюе так:
– мы робім толькі тое, што нам падабаецца, незалежна ад інтарэсаў публікі ці начальства
– мы ня скоўваем сябе літаратурнымі, драматычнымі, жанравымі ці стылявымі рамкамі
– цела – гэта першаснае, гэта самае блізкае, што ёсьць у чалавека
– трэба зьдзіўляць і зьдзіўляцца, залішняя ўпэўненасьць у разуменьні сьвету – шкодная
– у сфэры нашых зацікаўленасьцяў: гратэск, буфанада, карнавал, архаічныя, рытуальныя і першасныя формы тэатру, сучаснае сынтэтычнае мастацтва, імправізацыя, розныя формы псыхафізычнага трэнінгу.

Апошні праект "Жэсту" – Бута-акцыя "Ёлка У" – пастаўленая з удзелам этна-рок групы "Плато" і менскага Тэатра Юнага Глядача. Гэты спэктакль тэатар прадстаўляе на фэстывалі "Менская Вясна"

У спэктаклі ўдзельнічаюць:

Слава Іназемцаў
Галіна Яроміна
Сяргей Масько
Юры Бенько
Тацяна Ларыёнава
Мікалай Маркоўка (тэхнік)
Тацяна Кіеня
Алена Трубчык
Антон Шылай
Аляксей Іваноў
Ігар Сідорчык
Жана Друцкая-Чацьверакова
Андрэй Румянцаў
Мацьвей Сабураў
Алена Ціхмановіч
Дзяніс Сікорскі



## ПЭРФОРМАНС І ІНСТАЛЯЦЫЯ

**Mieczyslaw Skalimowski / Мечыслаў Скалімоўскі**
**Бяла-Падляска, Польшча**
Нарадзіўся ў 1955. Працуе ў галінах інсталяцыі, жывапісу і малюнку. Супрацоўнічае з галерэяй BWA ў Бяла-Падляскай.
Інсталяцыя "Помнік"

**Jukasz Giawacki / Лукаш Главацкі**
**Люблін, Польшча**
Нарадзіўся ў 1964. Займаецца жывапісам, інсталяцыяй, пэрформэнсам, канцэптуальнымі мастацтвамі.
Пэрформанс "Фундамэнт"

**Jagna Ciuchta / Ягна Ціхута**
**Познань, Польшча**
Студэнтка Акдэмі мастацтваў у Познані. Займаецца жывапісам, інсталяцыяй, відэа і пэрформансам
Пэрформанс "Panstwo – Miasto" / "Дзяржава–Горад"

**Віктар Пятроў**
**Менск, Беларусь**
Нарадзіўся ў 1957 у Менску. За апошнія 25 год браў удзел у дзясятках выставаў і акцыяў у Беларусі і па-за яе межамі. Апошнія гады працуе пераважна як пэрформэр. Куратар першага ў Беларусі міжнароднага фэстывалю пэрформансу "Навінкі'99". Піша мастацкія тэксты.
Пэрформанс "Bio Nature Land"

**Аляксандар Родзін (Мітрыч)**
**Менск, Беларусь**
Нарадзіўся ў 1948. Займаецца жывапісам, інсталяцыяй, пэрформэнсам, піша тэксты. Працуе ў накірунку сінтэзу розных мастацкіх жанраў.
Пэрформанс "Вэнэрычныя хронікі"

**Лявон Вольскі**
**Менск, Беларусь**
Нарадзіўся ў 1965. Лідэр рок-гурта "NRM". Музыкант, паэт, мастак. Працуе над сінтэзам рок-музыкі і пэрформэнса.
Пэрформанс "Пачціць сваім прысуцтвіем"

**Аляксей Іваноў**
**Менск, Беларусь**
Нарадзіўся ў 1978. Стваральнік арыгінальных мастацкіх праектаў у кантэксьце цела – прастора.
Займаецца плястыка-харэаграфічнымі тэхнікамі.
Пэрформанс "Цыкль"

**Дзяніс Раманоўскі**
**Менск, Беларусь**
Нарадзіўся ў 1970 у Менску. Працуе ў галінах інсталяцыі й пэрформансу, мульцімэдыі й web-арту. Гісторык мастацтва.
Інсталяцыя-пэрформанс Дзюрка: / камунікацыйная плынь / ілюзыя міфа / Аркадыя. Тут

vytoki.net

## ВІДЭАФІЛЬМЫ

Фільм „Brother Bread, Sister Puppet" Джэфа Фарбэра / Jeff Farber паказвае мэтады працы і стыль прадстаўленьняў, якія акрэсьлілі арыгінальнасьць і ўплыў "Bread and Puppet Theater" на лялечны тэатар і сцэнічныя экспэрымэнты.

Тэатар "Хлеба й лялькі", які быў заснаваны танцорам і скульптарам Пэтэрам Шуманам / Peter Schumann у 1962, належыць сёньня да найбольш істотных тэатральных зьяваў XX ст. У фільме Фарбэра зафіксаваная падрыхтоўка да штогадовага сьвята тэатру, якое праводзіцца з 1975, і спэктакль „Our Domestic Resurrection Circus", паказаны на ім. Кожнае лета, у адзін з уйкэндаў тэатар, разам з амаль сотняй дабраахвотнікаў, рыхтуе гэтае прадстаўленьне, якое будзе потым паказанае 25 тысячам гледачоў, прыяжджаючым на фэрму Шумана ў Гловэр, стану Вэрмонт. Прадстаўленьне мае грамадзкі і палітычны сэнс, але апроч таго ёсьць цудоўным рытуалам, які прысьвечаны чалавечнасьці й радасьці жыцьця, – усё ў выкананьні вялізарных лялек, для анімацыі якіх патрабуецца па некалькі асобаў.

"The Wooster Group" – фільм ангельскай тэлевізіі, зьняты ў другой палове 80-х, – дакумэнт, які распавядае пра дзейнасьць адной з найбольш цікавых і ўплывовых тэатральных групаў сучаснай Амэрыкі. Гісторыя "The Wooster Group" мае свой пачатак у тэатральным буме часоў росквіту амэрыканскай контркультуры. Заснавальнікі тэатру : Elizabeth LeCompte і Spalding Gray працавалі ў тэатры "The Performance Group", пад ягонай шыльдай былі паказаныя і першыя спэктаклі, якія пазьней увайшлі ў рэпэртуар "The Wooster Group" – "Sakonnet Point" (1975), "Point Judith (An Epilog)" (1979) ды іншыя. Калі "The Performance Group" распалася ў 1980, група актораў, лідэрам якой была Elizabeth LeCompte пераняла сядзібу тэатра – "The Performing Garage" і пастанавіла зьмяніць назву на "The Wooster Group". Гэты тэатар дзейнічае дагэтуль.

"The Wooster Group" – адзін з найбольш бескампрамісных амэрыканскіх тэатраў, як ў мастацтве, гэтак і ў сваёй грамадзкай пазыцыі. Тэатар не вагаецца перад разбурэньнем любых табу, хаця й не заклікае да рэвалюцыі – проста заўсёды ёсьць верным самому сабе.

У фільме паказаныя фрагмэнты з найбольш вядомых і кантравэрсыйных спэктакляў – "Route 1 & 9" (1981) і "L.S.D. (... Just the High Points...)" (1984).

"84 дні хаджэньня", "Студзеньская рака" і "Гукі Сэрбіі" – фільмы, у якіх адлюстраваная кроніка падзей, што адбыліся ў Бэлградзе на мяжы 1996 і 1997. Пратэсты, повадам для якіх стала фальшаваньне ўладай Мілошэвіча выбараў, прынялі форму шматгадзінавых маршаў па вуліцах Бэлграду і іншых сэрбскіх гарадоў. У іх бралі ўдзел ад 10 тасячаў да паўмільёну чалавек. Гэтыя "маршы дэмакратыі" выклікалі масавы рух творчасьці. Амаль усе ўдзельнікі сталі акторамі грандыёзнага вулічнага тэатру.

„Major, albo rewolucja krasnali" / "Маёр, альбо рэвалюцыя гномаў" (рэжысёр Maria Zmarz-Koczanowicz / Марыя Змаж-Кахановіч ) – гэта кінааповяд пра падзеі так званай "Pomaranczowej Alternatywy" / "Апэльсінавай Альтэрнатывы", надзвычай цікавага мастацка-грамадзкага руху 1987–89. Карыстаючыся практыкай хэпэнінгаў, пэрформэнсу, альтэрнатыўнага тэатру 70-х, творца гэтага руху Waldemar Frydrych („Major") / Вальдэмар Фыдрых ("Маёр") вынайшоў новыя формы вулічных акцыяў. Ідэя была геніяльнаю ў сваёй прастаце: у краіне, дзе кожная ініцыятыва, не зацьверджаная партыйнымі ўладамі, была нелегальнай, Маёр арганізаваў незалежныя адзначэньні дзяржаўных сьвятаў і нявінныя вулічныя забавы, напрыклад, дзень абароны дзяцей. Месцам гэтых акцыяў была вуліца Сьвідніцка, у самым цэнтры Ўроцлава. Адказам на гэтыя зьнешне "непалітычныя" акцыі было паляваньне міліцыянтаў на моладзь, апранутую ў гномаў (Дзень Дзіцяці 1988), ці арышты ўсіх мінакоў, апранутых у чырвонае на 70-ю гадавіну кастрычніцкай рэвалюцыі. Заключнаю часткаю акцыяў былі абавязковыя мастацкія выступы арганізатараў і ўдзельнікаў "Апэльсінавай Альтэрнатывы" у міліцэйскім камісарыяце.

У фільме можна ўбачыць ініцыятара руху і ягоных бліжэйшых памочнікаў, фрагмэнты некалькіх акцыяў і сцэнкі з перадвыбарнай кампаніі Маёра, які выставіў сваю кандыдатуру на прэзыдэнцкіх выбарах 1990.



vyteki.net